**Доўнар Таісія Іванаўна**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (Мінск, Беларусь)*

# СТАНАЎЛЕННЕ І РАЗВІЦЦЁ НАВУКОВАЙ ШКОЛЫ ГІСТОРЫІ ДЗЯРЖАВЫ І ПРАВА БЕЛАРУСІ

Патрэба ў навуковых пошуках у сферы права існуе заўсёды. Пастаянныя трансфармацыі дзяржаўна-прававой сферы патрабуюць пераасэнсавання мінулага і папярэдніх навуковых падыходаў адносна такіх палітычных інстытутаў як права і дзяржава. Асабліва гэта тычыцца сучаснага этапа развіцця беларускай дзяржаўнасці, калі прававая навука прызвана фарміраваць адносіны да права як сродка ўдасканалення і гарманізацыі грамадскіх адносін.

Роля гісторыка-прававой навукі мае асаблівае значэнне, паколькі яна дапамагае прааналізаваць і асэнсаваць папярэдні ход гістарычнага развіцця, улічыць ранейшыя недахопы, на падставе чаго можна прагназаваць перспектывы далейшага развіцця нацыянальнай дзяржаўнасці і прапаноўваць найбольш прымальныя механізмы яе ўдасканалення. Пры гэтым патрэбна адзначыць, што доўгі час пытанні гісторыі дзяржавы і права Беларусі мала падвяргаліся навуковай распрацоўцы. Асабліва ў папярэднія гістарычныя перыяды даследаванне прававой спадчыны, якое з’яўляецца важнейшай задачай гісторыка-прававой навукі, стрымлівалася шэрагам аб’ектыўных і суб’ектыўных фактараў. У сувязі з гэтым у навуцы заставаліся шматлікія і значныя прабелы. Амаль не друкаваўся мінулы дакументальна-прававы матэрыял.

Нягледзячы на гэта, паступова закладваліся падставы для развіцця гісторыка-прававой навукі. Так, пасля ўтварэння беларускай савецкай дзяржаўнасці і адкрыцця у 1921 г. Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта першы рэктар універсітэта У.І.Пічэта разам са студэнтамі займаўся аналізам гістарычнага дакументальна-прававога матэрыялу. Ён выдаў шмат навуковых прац, прысвечаных сацыяльна-культурнай, эканамічнай, прававой гісторыі Беларусі, а таксама аб’яднаў вакол сябе кола даследчыкаў (А.В.Бурдзейка, Д.І.Даўгяла, В.Д.Дружчыц, Т.І.Забэлла, К.І.Таўсталес і інш.), якія актыўна распрацоўвалі шматлікія пытанні айчыннай гісторыі, закранаючы пры гэтым і гісторыка-прававыя праблемы. Напрыклад, В.Д.Дружчыц даследаваў пытанні Магдэбурскага права ў гарадах Беларусі, Т.І.Забэлла – развіцця шлюбна-сямейнага права і г. д.

Актывізацыі даследаванняў у 1920-я гг. садзейнічала і заснаванне ў 1922 г. Інстытута беларускай культуры, дзе разам з вывучэннем актуальных праблем дзяржаўна-прававога будаўніцтва на Беларусі (напрыклад, даследаваннем прычын злачыннасці) даследаваліся пытанні прававой гісторыі, у кантэксце якой пачалося выданне дзяржаўна-прававых актаў XVI-XVII стагоддзяў, уваходзячых у склад Літоўскай метрыкі. Напрыклад, быў выдадзены трохтомны «Беларускі архіў» (1927–1930).

Аднак толькі ў пасляваенны перыяд намаганнямі беларускіх навукоўцаў пачынаюцца значныя зрухі ў сферы распрацоўкі айчыннай дзяржаўна-прававой гісторыі. Значным прарывам у гэтым накірунку стала выданне ў 1958 г. у БДУ калектыўнай працы «Очерки по истории

государства и права БССР» (Б.Е.Бабіцкі, Ф.І.Гаўзе, І.І.Гарэлік, Г.А.Павецьяў, Л.А.Рудзіцкі, І.С.Тышкевіч, Ю.П.Смірноў, В.Ф.Чігір), у якой з пазіцый тагачаснай савецкай гісторыка-прававой навукі разглядаліся пытанні развіцця дзяржавы і права БССР з моманта яе ўзнікнення да 1934 года. У 1969 г. у выдавецтве БДУ былі выдадзены калектывам аўтараў (Б.Е.Бабіцкі, А.А.Галаўко, Ф.І.Гаўзе, В.А Дарогін і інш.) «Очерки по истории государства и права БССР» (выпуск другі), дзе разглядаліся пытанні развіцця дзяржавы і права БССР з 1936 па 1968 гг.. Адказным рэдактарам і сааўтарам гэтай кнігі быў Іосіф (Язэп) Аляксандравіч Юхо, які з 1963 г. першым пачаў выкладаць на юрыдычным факультэце БДУ новую вучэбную дысцыпліну – гісторыю дзяржавы і права Беларусі. У сваіх лекцыях і публікацыях І.А.Юхо імкнуўся абудзіць у кожным студэнце самастойнасць мыслення, актыўную жыццёвую пазіцыю, любоў да роднай Беларусі, сапраўдным патрыётам якой ён быў. Вынікам гэтага стала павышэнне самасвядомасці студэнтаў, іх павагі да гісторыі ўласнага народа і цікавасці да гісторыка-прававых даследаванняў. Распрацоўка і ўкараненне ў выкладчыцкую практыку БДУ гэтай вучэбнай дысцыпліны стала не толькі важным педагагічным і навукова-метадычным дасягненнем навукоўца, але з’явілася значным этапам у развіцці гісторыка-прававой навукі і станаўленні навуковай школы гісторыі дзяржавы і права Беларусі.

І.А. Юхо, які спачатку абараніў кандыдацкую дысертацыю ў 1956 г., а затым у 1980 г. доктарскую дысертацыю, стаў заснавальнікам беларускай гісторыка-прававой школы. Ім былі падрыхтаваны 2 дактары юрыдычных навук і больш 10 кандыдатаў юрыдычных навук. Навуковец ўнес значны ўклад у развіццё беларускай гісторыка-прававой навукі. Ім было апублікавана звыш 200 навуковых прац, у тым ліку некалькі манаграфій, навучальных дапаможнікаў, і шматлікіх артыкулаў па гісторыі дзяржавы і права Беларусі. Гэтыя працы былі прысвечаны самым актуальным пытанням гісторыі дзяржавы і права Беларусі – паходжанню назвы «Беларусь», станаўленню беларускай дзяржаўнасці, фарміраванню тэрыторыі Беларусі, прававому становішчу насельніцтва, гісторыі заканадаўства, палітыка-прававым поглядам беларускіх мысліцеляў, уніям Вялікага Княства Літоўскага з Польшчай, уплыву Польшчы і Расіі на гісторыю беларускага народа і інш. Перш за ўсё навуковец звяртаў увагу на мала даследаваныя пытанні гісторыі беларускага народа. Пры гэтым ён выказваў і абгрунтоваў вельмі самастойныя думкі і цікавыя меркаванні па праблемных пытаннях айчыннай гісторыі, часам такія, што супярэчылі афіцыйным поглядам савецкай гістарычнай навукі. Так, ён выказаў свае пазіцыі па праблеме фарміравання тэрыторыі Беларусі, абгрунтаваў тэзіс аб значна больш старажытным паходжанні беларускай дзяржаўнасці, чым афіцыйна вызначанае ў гістарычнай навуцы, аб пераважна беларускім этнічным характары Вялікага Княства Літоўскага, абгрунтоўваў і падкрэсліваў значнасць і прагрэсіўнасць поглядаў беларускіх мысліцеляў і інш. Ім упершыню была выказана думка аб непасрэдным удзеле вялікага беларускага гуманіста і мысліцеля Ф.Скарыны ў падрыхтоўцы знакамітага звода законаў – Статута 1529 г. На падставе сістэмнага аналізу помнікаў права Беларусі ён зрабіў вывад аб нацыянальнай адметнасці беларускага права і параўнальна высокай прававой культуры беларускага народа. Некалькі навуковых прац ён

прысвяціў выдатнаму дзеячу нацыянальна-вызваленчага руху Тадэвушу Касцюшку і інш. У шэрагу артыкулаў ім разглядаліся пытанні гісторыі юрыдычнай навукі ў Беларускім дзяржаўным універсітэце і ўклада навукоўцаў у яе развіцце. І.А.Юхо рабіў намаганні і па папулярызацыі навукі гісторыі дзяржавы і права Беларусі. Так, навуковец прыняў удзел у выданні на англійскай мове кніг аб гістарычным шляху беларускага народа (2005, 2006).

Менавіта ўсё гэта служыла падставай для зацікаўленасці іншых даследчыкаў і актывізацыі навуковых даследаванняў. Вакол яго сфарміравалася кола навукоўцаў, якія працягвалі даследаванні айчыннай гісторыі права, акцэнтавалі ўвагу на самых актуальных і мала даследаваных пытаннях. У працах гісторыкаў права даследавалася дзяржаўна-прававое развіццё Беларусі на папярэдніх гістарычных этапах развіцця, у тым ліку эвалюцыя дзяржаўных і судовых органаў, прававое становішча насельніцтва, развіццё грамадзянскага, крымінальнага, канстытуцыйнага, сямейнага, ваеннага заканадаўства і інш. Так, С.Ф.Сокал прысвяціў свае кнігі развіццю палітыка-прававой думкі Беларусі і пэўным этапам яе гісторыі. У кнігах І.І. Марціновіч характарызавалася гісторыя судовых устаноў Беларускай ССР. А.Ф. Вішнеўскі выдаў некалькі кніг увогуле па гісторыі дзяржавы і права Беларусі. І.А Вішнеўская прысвяціла свае публікацыі гісторыка-прававой думцы Беларусі. У публікацыях Т.І. Доўнар раскрываліся характэрныя рысы і тэндэнцыі развіцця права Беларусі феадальнага перыяду, адзначаліся асаблівасці кадыфікацыі заканадаўства ў XVI ст., адметнасць прававой гісторыі і прававой культуры Беларусі і іх узаемасувязь з агульнаеўрапейскім працэсам эвалюцыі права. Асобныя яе працы былі прысвечаны гісторыі канстытуцыйнага, крымінальнага, грамадзянскага права.

Удзельнікі навуковай школы засяроджвалі увагу на выяўленні характэрных рысаў і асаблівасцяў у дзяржаўна-прававым развіцці Беларусі на папярэдніх гістарычных этапах, на важнейшых дасягненнях ў развіцці права і прававой культуры беларускага народа і г.д. Навукоўцы прыкладвалі намаганні ў перавыданні помнікаў Беларусі, прынялі актыўны ўдзел у падрыхтоўцы шэрага энцыклапедычных выданняў: «Юрыдычны слоўнік»(1989 г.), «Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 г.» (1989), «Энцыклапедыя гісторыі Беларусі» (1993-2003), «Мысліцелі і асветнікі Беларусі (1995), «Асветнікі зямлі Беларускай» (2001) і інш. Значнай навуковай падзеяй стала выданне ў 2001 г. кнігі «Гісторыя канстытуцыйнага права Беларусі (Р.А.Васілевіч, Т.І.Доўнар, І.А. Юхо), а таксама перавыданне у 2003 г. Статута 1566 г. (Т.І. Доўнар, І.А. Юхо, У.М. Сатолін). Гісторыкамі-правазнаўцамі (А.Ф. Вішнеўскі, Т.І. Доўнар, В.А. Круталевіч, М.У. Сільчанка, В.А. Шаўкапляс, І.А. Юхо і інш.) былі апублікаваны шматлікія навуковыя артыкулы і выдадзены шэраг навучальных дапаможнікаў па гісторыі дзяржавы і права Беларусі.

Працягваючы кіраўніцтва навуковай школай, прафесар кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права юрыдычнага ф-та БДУ Доўнар Т.І., ажыццяўляе каардынацыю навуковых даследаванняў у сферы гісторыка-прававой навукі, кіруе аспірантамі і саіскальнікамі. Ёю апублікавана звыш 280 навуковых прац, у тым ліку 4 манаграфіі, падручнік, два курсы

лекцый і звыш 10 вучэбных і вучэбна-метадычных дапаможнікаў. Так, у апошнія гг. былі апублікаваны: падручнік «Гісторыя дзяржавы і права Беларусі» (2014) з грыфам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, манаграфія «Права Беларусі ў кантэксце гістарычнай эвалюцыі дзяржаўнасці» [Электронны рэсурс: ISBN 978-985-566-576-6] (2018), калектыўная манаграфія «Курс уголовного права в 5 т. Общая часть. Т.1 : Учение о преступлении» (2018) і інш. Пад яе кіраўніцтвам былі абаронены адна доктарская дысертацыя і 9 кандыдацкіх дысертацый па спецыяльнасці 12.00.01. – тэорыя і гісторыя права і дзяржавы; гісторыя палітычных і прававых вучэнняў. Пры гэтым у сферы айчыннай гісторыка-прававой навукі пазначылася тэндэнцыя павелічэння колькасці навуковых публікацый і амплітуды навуковай тэматыкі. Аб гэтым сведчыць тэматыка публікацый і абароненых дысертацый. Так, у пачатку XXI ст. у БДУ пад кіраўніцтвам Т.І.Доўнар былі паспяхова абаронены кандыдацкія дысертацыі: па прававому становішчу маёмасці праваслаўнай царквы (М.Г.Шукан, 2007); гісторыі ваеннага права і ваеннай юстыцыі (В.В.Каляда, 2010; А.І.Адамюк, 2012); гісторыі грамадзянскага права БССР (Ю.І. Кавалеўская, 2011); гісторыі крымінальнага права БССР (С.А. Гур’еў, 2016); гісторыі айчыннага натарыяту (У.М. Ангельскі, 2016); гісторыі адвакатуры Беларусі (А.А. Гур’ева, 2017). удзельнікамі навуковай школы былі апублікаваны шматлікія навуковыя артыкулы, а таксама манаграфіі і вучэбныя дапаможнікі. Так, выдалі манаграфіі: Голубева Л.Л. «Наследственное право феодальной Беларуси: по законодательству Великого княжества Литовского» (2002); Ю.П. Доўнар «Судовая рэформа XVI ст. у Вялікім Княстве Літоўскім» (2007); Адамюк А.І. «Военно-уголовная юстиция Беларуси» (2006) і інш. Навукоўцы прынялі ўдзел ў выданні «Беларускай юрыдычнай энцыклапедыі ў 4 т. (2007-2013).

У межах навуковай школы ажыццяўляецца не толькі падрыхтоўка навуковых кадраў, але выпрацоўваюцца накірункі дальнейшых навуковых даследаванняў шляхам абмена вопытам з цеснага ўзаемадзеяння з навукоўцамі ВНУ Рэспублікі Беларусь і замежнымі вучонымі. Аб гэтым сведчаць сумесныя публікацыі навукоўцаў і падрыхтаваныя разам з Нацыянальным цэнтрам прававых даследаванняў, Беларускім дзяржаўным эканамічным універсітэтам, Беларускім інстытутам правазнаўства, Акадэміяй МУС Рэспублікі Беларусь, Гродзенскім дзяржаўным універсітэтам навуковыя і навукова-практычныя канферэнцыі. У тым ліку ў 2010 г. была праведзена міжнародная навуковая канферэнцыя, прысвечаная памяці заснавальніка нацыянальнай гісторыка-прававой навуковай школы доктара юрыдычных навук прафесара І.А.Юхо. У 2011 г. былі выдадзены матэрыялы канферэнцыі і кніга «Памяць і слава», у якую ўвайшлі: манаграфія даследчыка аб прававым становішчы насельніцтва Беларусі ў XVI ст. (выдадзена ў 1978), бібліяграфія яго публікацый, звесткі аб навуковай школе і ўспаміны яго калег і вучняў. Прадстаўнікі навуковай школы прымаюць удзел у арганізацыі і правядзенні шматлікіх навуковых і навукова-практычных міжнародных і рэспубліканскіх навуковых канферэнцый, у тым ліку арганізоўваюць іх правядзенне па актуальных пытаннях гісторыі дзяржавы і права Беларусі ў БДУ. Так, толькі на працягу 2017-2018 гг. імі быў прыняты ўдзел у шасці канферэнцыях:

«Палітычная і прававая думка ВКЛ і Рэчы Паспалітай ў XVI-XVIII стагодддзях і яе ўплыў на права і прававую сістэму» (лістапад 2017); «Традиции университета : От Франциска Скорины до современности» (кастрычнік 2017); «1917 год в исторических судьбах Беларуси» (студзень 2018) і інш., на якіх абмяркоўваліся праблемныя пытанні і высоўваліся новыя ідэі, у тым ліку ў сферы пошуку больш эфектыўных метадаў даследавання.

Таксама ўдзельнікамі навуковай школы сістэматычна праводзяцца ў БДУ круглыя сталы па актуальных і праблемных гісторыка-прававых пытаннях. Напрыклад, у кастрычніку 2014 г. абмяркоўвалася тэма: «Праблемныя пытанні тэорыі і гісторыі беларускай дзяржаўнасці і права», у красавіку 2016 г.: «Статут Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага 1566 г.: да 450-годдзя выдання

Важным накірункам навукова-даследчай работы вучоныхправазнаўцаў з’яўляецца удзел у дзяржаўных праграмах навуковых даследаванняў, у распрацоўцы, навуковай экспертызе і навуковым каменціраванні праектаў нарматыўна-прававых актаў і інш. Праводзіцца праца па ўкараненні вынікаў даследаванняў у практыку. Так, на працягу 2006–2010 гг. у кантэксце дзяржаўнай праграмы «Эканоміка і грамадства» пад кіраўніцтвам праф. Доўнар Т.І. навукоўцамі БДУ распрацоўвалася тэма «Гісторыя ўзнікнення і развіцця дзяржаўнасці і нацыянальнай прававой сістэмы Беларусі». Быў вынесены шэраг прапаноў па ўдасканаленні заканадаўства, сістэматызацыі заканадаўства, пытаннях праватворчасці. Некаторыя палажэнні і вывады былі прадстаўлены ў праватворчыя органы Рэспублікі Беларусь, укаранены ў вучэбны працэс. Таксама шэраг вынікаў дысертацыйных даследаванняў быў накіраваны ў праватворчыя органы і ўкаранены ў вучэбны працэс БДУ.

У сучасны перыяд распрацоўваецца новая важная навуковая тэма «Прававая палітыка Рэспублікі Беларусь: канцэптуальныя, метадалагічныя і гістарычныя заканамернасці развіцця беларускай дзяржаўнасці і права ва ўмовах глабальнай нестабільнасці», у кантэксце якой працягваюцца навуковыя даследаванні шматлікіх гісторыкаправавых праблем, у тым ліку адносна гісторыі развіцця і шляхоў удасканалення беларускага канстытуцыяналізму, палітычнай сістэмы, заканадаўства, праватворчасці, а таксама адносна шляхоў забеспячэння эканамічных, прававых і сацыяльных гарантый суверэнітэта Рэспублікі Беларусь.

Між тым патрэбна адзначыць, што, нягледзячы на пэўныя дасягненні, у айчыннай гісторыка-прававой навуцы маюцца значныя недахопы. Перш за ўсё яны звязаны з малой колькасцю навуковых кадраў – гісторыкаў права, адсутнасцю спецыяльных кафедр у вышэйшых навучальных установах і акадэмічнага цэнтра па даследаванню гісторыі дзяржавы і права Беларусі. Менавіта таму ў гісторыка-прававой навуцы застаюцца значныя прабелы. Так, мала даследаванымі застаюцца пытанні гісторыяграфіі гісторыка-прававой навукі, эвалюцыі палітычных інстытутаў, гісторыі беларускага канстытуцыяналізму і парламентарызму, развіцця асобных інстытутаў і галін права, гісторыі развіцця цэнтральных, мясцовых органаў і судовых устаноў, магдэбургскага права ў Беларусі як спецыфікі спалучэння

мясцовых і агульнадзяржаўных інтарэсаў, развіцця прававой думкі, узаемадзеяння айчыннай прававой культуры з заходнееўрапейскай культурай і інш. Акрамя таго, патрабуюць ужо пераасэнсавання многія пытанні савецкага перыяду развіцця дзяржавы і права Беларусі. Увогуле даўно наспела неабходнасць больш актыўнага, а галоўнае – сістэмнага даследавання паэтапнага дзяржаўна-прававога развіцця Беларусі.

Менавіта ліквідацыя пазначаных недахопаў і актывізацыя навуковых даследаванняў стане перадумовай для больш дакладных уяўленняў пра гістарычную эвалюцыю нацыянальнай дзяржаўнасці і перспектывах айчыннага прававога развіцця.

**Ершова Ольга Игоревна**
*Белорусский государственный университет (Минск, Беларусь)*

## И. М. СОЛОВЬЕВ: У ИСТОКОВ ФОРМИРОВАНИЯ БЕЛОРУССКОЙ ПЕДАГОГИЧЕСКОЙ НАУКИ

Белорусский государственный университет в 1920-е гг. стал колыбелью белорусской педагогической науки. Значительный вклад в ее развитие в данный период внес Иван Михайлович Соловьев, который в 1921–1924 гг. работал в должности профессора кафедры теории и истории педагогики БГУ и преподавал дисциплины психолого-педагогического цикла.

И.М. Соловьев родился 23 июня 1878 г. в г. Кострома в семье судебного следователя. В 1897 г. окончил с золотой медалью Костромскую мужскую гимназию и поступил на историко-филологический факультет Московского университета. В студенческие годы он увлекся изучением психологии и передовых педагогических идей, стал последователем такого нового направления в науке, как экспериментальная педагогика. После окончания университета Соловьев преподавал в средних учебных заведениях Екатеринославля и принимал участие в работе местного научного общества по экспериментальной педагогике. [14, л. 1]

В 1905 г. И.М. Соловьев переехал в Москву, где преподавал педагогику и психологию в женских гимназиях и Николаевском сиротском институте. На Высших женских педагогических курсах он читал лекции по педагогике и детской литературе, а в Московском народном университете имени А.Л. Шанявского – лекции по вопросам организации школьного дела. [14, л. 1]

В 1906–1917 гг. И.М. Соловьев активно участвовал в российском общественно-педагогическом движении, присутствовал на всех Всероссийских съездах по вопросам педагогической психологии (1906–1909 гг.) и экспериментальной педагогики (1910–1916 гг.). На общественных началах он состоял членом ряда организаций: Педагогического общества при Московском университете, педагогической секции Технического общества, Общества экспериментальной психологии, Союза деятелей средней школы. В 1908-1912 гг. Соловьев работал в психологической лаборатории Московского педагогического собрания в качестве научного сотрудника под руководством профессора А.Н. Бернштейна – одного из организаторов российского психоаналитического движения [14, л. 1].